Падтрымай "Вясну" на PATREON

Палітыка Алеся Лагвінца будуць судзіць за Дзень Волі

19.04.2016 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў
Крыніца: «Наша Ніва»



Алесь Лагвінец

На аднаго з арганізатараў акцыі на Дзень Волі, намесніка старшыні Руху «За Свабоду» Алеся Лагвінца склалі пратакол за ўдзел у акцыі 25 сакавіка. 28 красавіка адбудзецца суд,паведамляепрэс-служба руху «За свабоду».

«25 сакавіка, в 18.50 па праспекце Незалежнасці, 73 у г. Мінску прыняў актыўны ўдзел у несанкцыяваным мітынгу без дазволу Мінгарвыканкаму, што выяўлялася ў сумесным масавым знаходжанні грамадзянаў па ўказанаму адрасу, выкрыківаў лозунгі, чым парушыў прадугледжаны арт. 10 Закона РБ «Аб масавых мерапрыемствах»», — сказана ў пратаколе за подпісам старэйшага ўчастковага інспектара Савецкага РУУС Мінска Віталія Ермаловіча.

Па ягоных дадзеных, у дзеяннях Лагвінца заўважаныя прыкметы парушэння артыкула 23.34 ч.1 (парушэнне парадку арганізацыі ці правядзення масавых мерапрыемстваў) КоАП.

«Бачна, што мне прыйшоў «тыповы пратакол» на заяўніка Дня Волі. Пратакол — узор міліцэйскага фармалізму і непрафесійнасці», — пракаментаваў сайту Рух.by Алесь Лагвінец.

Па-першае, кажа ён, «пратакол ігнаруе факт, што «сумеснае масавае знаходжанне» грамадзянаў па адрасе пр-т Незалежнасьці, 73 было дазволенае Мінгарвыканкамам як месца збору ўдзельнікаў святкавання».

«Па-другое, як арганізатар я знаходзіўся на месцы збору грамадзянаў, якія нават паводле вельмі недэмакратычнага закону «Аб масавых мепрапрыемствах» маюць права падчас збору абмяркоўваць УГОЛАС мэты і прычыны іхнага сходу. Як арганізатар я зачытаў зварот Старшыні Рады БНР Івонкі Сурвілы да беларускага народу», — дадаў намеснік старшыні руху «За Свабоду».


Ён таксама звярнуў увагу на тое, што у «старэйшага лейтэнанта Віталія Ермаловіча, відаць, збіўся гадзіньнік, бо зварот старшыні Сурвілы я зачытаў а 18.30, а не а 18.50».

«Непрафесіяналізм міліцыі таксама праяўляецца ў тым, што яны адмаўляюцца перакрыць рух транспарту на момант перасячэння вуліцаў удзельнікамі шэсця. Прымушаючы людзей праз пагрозы і запужванні спыняцца на перакрыжаваннях, яны ствараюць істотныя пагрозы для жыцця і здароўя ўдзельнікаў масавых мерапрыемстваў», — заключыў Алесь Лагвінец.

Суд па справе намесніка старшыні Руху прызначаны на 17:00 28 красавіка ў судзе Цэнтральнага раёна Мінску. Суддзя на працэсе — Наталля Вайцяховіч.

Твитнуть







СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ


Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO




ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

Валерыя Цапкалу завочна асудзілі да 17 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму (дапоўнена)

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh